# БЕЛАРУСКІ РАДЫЁТЭАТР І ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ СУЧАСНІКАЎ: АЛЕГ ВІНЯРСКІ

*У.А. Трапянок, Мінск, БДУКіМ*

Гісторыя беларускага радыёвяшчання налічвае амаль 9 дзясяткаў гадоў. 15 лістапада 1925 г. упершыню ў эфіры прагучалі словы «Гаворыць Мінск!». Радыёстанцыя РВ-10 імя Саўнаркама БССР стала трансліраваць перадачы ў радыусе да 300 км працягласцю 30 мін. за суткі [1, с. 17]. Амаль з першых дзён прыярытэтным напрамкам вяшчання абраны літаратурна-мастацкі.

Годам нараджэння айчыннага радыётэатра лічыцца 1934, калі ў эфіры адбылася прэм'ера спектакля паводле першай радыёп'есы драматурга В. Палескага-Станкевіча «Радня». У канцы 1940–1950-х гг. набыла вялікую папулярнасць рубрыка «Тэатр ля мікрафона» [2, с. 290]. З таго часу пачаўся актыўны перыяд стварэння радыёспектакляў, якія сёння можна назваць «залатым фондам» Беларускага радыё. Над пастаноўкамі працавалі артысты калектываў БДТ-1 і БДТ-2. Для радыёэфіру адаптаваліся творы класікаў айчыннай літаратуры: Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, Э. Самуйлёнка, М. Лынькова, К. Губарэвіча, К. Крапівы і інш.

Са з'яўленнем тэлебачання папулярнасць да радыётэатра толькі ўзрасла, паколькі праз успрыманне на слых у фантазіі чалавека нараджаюцца непаўторныя цэласныя карціны, якія куды больш цікавыя і прыцягальныя, чым тыя, што прапануюцца на экране. Гэтым, дарэчы, тлумачыцца сакрэт папулярнасці радыё ў слухачоў розных пакаленняў. У рэпертуар беларускага радыётэатра пачалі ўводзіць спектаклі паводле твораў замежных аўтараў, з'явіліся пастаноўкі для дзяцей.

На запісы запрашаліся артысты вядучых тэатраў краіны. У фондах Беларускага радыё захоўваюцца галасы Г. Глебава, Л. Давідовіч, У. Дзядзюшкі, П. Малчанава, Б. Платонава, Г. Макаравай, Л. Рахленкі, Л. Ржэцкай, С. Станюты, В. Тарасава і іншых акцёраў, чыя творчасць стала знакавай у прафесійным тэатры Беларусі. Значны ўклад у развіццё беларускага радыётэатра зрабілі рэжысёры Л. Алендэр, Т. Аляксеева, В. Анісенка, У. Багалюбскі, С. Гурыч, П. Данілаў, І. Лапцінскі, М. Троіцкая, С. Сцефановіч [2, с. 291]. Традыцыі, закладзеныя не адно дзесяцігоддзе таму, сёння працягвае рэжысёр Беларускага радыё Алег Вінярскі.

А. Вінярскі паходзіць з сям'і ваеннага, якая вельмі часта пераязджала. З магічнасцю радыё, асаблівасцямі чалавечага голасу і гукаў Алег пазнаёміўся ў Польшчы, калі слухаў польскае вяшчанне, запісы заходніх музычных калектываў. Там жа ён далучыўся да сусветнага кінематографа: моцныя ўражанні пакінулі стужкі класікаў кінамастацтва Ч. Чапліна, Б. Кітана, М. Антаніёні, Ф. Феліні, С. Спілберга. Менавіта праз кіно да Алега прыйшло разуменне гукаў, неабходнае для працы на радыё, паколькі асноўнымі трыма складнікамі стварэння атмасферы ў радыёпрасторы з'яўляюцца голас, музыка і шумы.

Творчыя здольнасці А. Вінярскі праявіў у школьныя гады, калі ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці. У 1979 г. яго сям'я пераехала ў Мінск. Варта было вызначацца з будучай прафесіяй. Алег выказаў жаданне паступіць у ваеннае вучылішча, каб працягнуць сямейную традыцыю. Паралельна ўзнікла жаданне падстраха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваццa, і юнак, пакуль яшчэ ўскосна знаёмы з акцёрскай прафесіяй, вырашыў паспрабаваць сілы ў журналістыцы. Пачаў друкаваць у газетах артыкулы на ваенную тэматыку, збіраў публікацыі, каб пасля падаць іх з дакументамі ў БДУ. Аднак цікавасць да мастацтва і жаданне рэалізаваць сябе ў творчасці ўзялі верх, і Алег пайшоў на праслухоўванне ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут.

На вучобу паступіў да народнага артыста Беларусі Г. Волкава і артысткі Рускага тэатра імя М. Горкага Г. Вішкаровай-Старкоўскай. Сярод педагогаў на курсе таксама былі артысты Купалаўскага тэатра М. Федароўскі і А. Мілаванаў. Пасля інстытута А. Вінярскі па размеркаванні трапіў у Віцебскі драмтэатр імя Я. Коласа, якім у той час кіраваў В. Мазынскі. Там Алег сыграў некалькі роляў. Пасля службы ў арміі малады артыст вярнуўся у Мінск і спрабаваў уладкавацца ў сталічныя тэатры.

У канцы 1985 г. Камітэт па радыёвяшчанні і тэлебачанні, які ўзначальваў Г. Бураўкін, праводзіў конкурс дыктараў. Паводле яго вынікаў А. Вінярскі стаў дыктарам-стажорам. У гэты час на Беларускім радыё працавалі рэжысёры В. Анісенка, які ўзначальваў рэжысёрскі аддзел, С. Гурыч, І. Лапцінскі, В. Кернажыцкая, С. Сцефановіч, В. Красоўская. Беларускае радыё праслаўлялі артысты мінскіх тэатраў С. Станюта, В. Тарасаў, Г. Аўсяннікаў, А. Памазан, Ю. Сідараў, Р. Янкоўскі, Л. Давідовіч, М. Захарэвіч, З. Зубкова, Р. Маленчанка, В. Кавалерава, Г. Кухальская, А. Сідарава, А. Падабед, Г. Маляўскі, а таксама А. Уладамірскі, Ю. Авяр'янаў і У. Кін-Камінскі – трыа, жаданае для ўсіх рэдакцый, паколькі гэтыя артысты валодалі бездакорнай галасавой тэхнікай, маглі выступаць у якасці вядучых і выконваць розныя характарныя ролі. Першай роляй А. Вінярскага стаў Унук у радыёспектаклі «Мой генерал» паводле рамана А. Ліханава (рэж. І. Лапцінскі). Падчас працы над пастаноўкай малады артыст улавіў магію радыёвяшчання і быў поўнасцю зачараваны ёю. У гэты перыяд на радыё за месяц ставілі па тры спектаклі, што выходзілі ў эфір па нядзелях у праграме «Тэатр перад мікрафонам». Алег выконваў эпізадычныя ролі ў спектаклях, чытаў выпускі навін і паступова загартоўваўся для стварэння ўласных пастановак. Паспрабаваць сябе ў якасці рэжысёра атрымалася пасля прыходу ў рэдакцыю «Беларуская маладзёжная». За аснову ў працы А. Вінярскі браў творы замежных аўтараў, сярод якіх А.К. Дойль, Р. Говард, С. Моэм, Ф. Дзюрэнмат і інш. Ставіў невялікія па фармаце спектаклі, якія выходзілі ў эфір у рубрыцы «Нядзельны трылер».

У 1996 г. А. Вінярскі выйграў конкурс і прыйшоў працаваць рэжысёрам у рэдакцыю літаратурна-драматычнага вяшчання. Паставіў спектаклі «Крылаты кінжал» паводле Г.К. Чэстэртана і «Жоўты твар» паводле А.К. Дойля (ролю Ш. Холмса выканаў артыст Г. Маляўскі, ролю Ватсана – У. Кін-Камінскі). У 1996 г. у эфір пачала выходзіць пастановачная праграма «Акно ў свет» (рэж. і рэд. – А. Казленя, гукарэжысёры: Л. Латушкіна, В. Красоўскі, А. Бублікаў, К. Пятруша). Раз на тыдзень яна прапаноўвала слухачам найлепшыя ўзоры беларускай і сусветнай літаратуры. За 5 гадоў было запісана больш за сто перадач, у якіх А. Вінярскі выступіў у якасці акцёра і кансультанта.

У другой палове 1990-х гадоў паўнавартасныя спектаклі раз на месяц ставіла Дзіцячая рэдакцыя. У ёй тады працавалі рэжысёры З. Паўлоўская, В. Кернажыц-

кая. У рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання, да якой адносіўся А. Вінярскі, адчуваўся творчы дэфіцыт, а ў нядзельным вячэрнім эфіры выходзілі, пераважна, фондавыя запісы.

У канцы 1999 г. І. Лапцінскі стварыў спектакль паводле п'есы айчыннага драматурга Л. Шчэрбача «Час дыназаўра». У цэнтры ўвагі – лёс беларуса Грышкі, які трапіў у крымінальнае асяроддзе, дзе яго выкарыстоўвалі ў якасці марыянеткі. Галоўную ролю ў пастаноўцы выканаў Алег Вінярскі. Яшчэ адна выдатная акцёрская работа А. Вінярскага – у спектаклі 2000 г. паводле п'есы «Маці і сын» фінскай пісьменніцы Э. Пенанен «Дзень нараджэння», рэжысёр – заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь І. Лапцінскі. У пастаноўцы ўздымаецца вострая сацыяльная праблема – алкагалізм. Алег выканаў ролю Сына-імянінніка, Маці сыграла народная артыстка Беларусі Г. Талкачова.

У наступныя гады ў сувязі з новымі рэформамі Беларускага радыё не паставілі ніводнага спектакля. Недахоп літаратуры ў эфіры ў нечым кампенсавала з'яўленне ў праграме канала «Культура» штодзённых рубрык «Літаратурная анталогія» і «Бестселер», дзе артысты, у тым ліку і А. Вінярскі, у прамым эфіры чытаюць творы айчынных і замежных аўтараў.

У 2006 г. пачалося адраджэнне традыцый беларускага радыётэатра. Так, да 20-годдзя Чарнобыльскай трагедыі Алег Вінярскі паставіў спектакль «Ігнатаў рубеж» паводле п'есы айчыннага аўтара В. Ткачова «Нехта ходзіць пад акном». Галоўны герой Ігнат жыве ў доме на забруджанай радыянуклідамі тэрыторыі. Пасля шматлікіх спроб угаварыць і прымусіць героя пакінуць родны дом, Ігнат падпальвае хату і гіне ў агні. Галоўную ролю выканаў народны артыст СССР Г. Аўсяннікаў.

У 2009 г. у эфіры Першага нацыянальнага канала транслiравалі прэм'еру спектакля «Пастка» паводле аповесці В. Быкава, праз год прагучала новая пастаноўка «Магнаты і сірата. Соф'я – княгіня Слуцкая» паводле твора У. Сыракомлі. У канцы 2012 г. адбылася яшчэ адна прэм'ера – «Адгукніся, браце» паводле п'есы Г. Марчука. Гэта паэтычны спектакль пра творчае станаўленне народнага паэта Беларусі Я. Коласа (рэж. – Алег Вінярскі).

*Літаратура*

1. *Васюкевич, А.* История радио – история страны / А. Васюкевич // Беларускае радыё: гісторыя, сучаснасць, перспектывы развіцця : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 80-годдзю Беларускага радыё, 20 снеж. 2005 г./ рэдкал.: С.В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.] – Мінск, 2005. – С.15–18.

2. Тэатральная Беларусь. : У 2 т. Т. 2 / рэдкал. : Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ